Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!



# ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

Орган Парткома і Прафкома Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта

№ 4 12 ЧЭРВЕНЯ 1935 г. № 4

## Аб студэнцкіх святах, прысвечаных канцу навучальнага года

Паводле пастановы ЦК ВЛКСМ 29-30 чэрвеня ва ўсіх гарадах Савецкага Саюза будуць праводзіцца агульна-гарадскія і агульна-вузаўскія студэнцкія святы, прысвечаныя вынікам 1934-1935 навучальнага года.

На гэтых святах павінны быць паказаны дасягненні навучальных устаноў у акадэмічнай рабоце, мастацкай, ваеннай і фізкультурнай самадзейнасці студэнцтва. На святах навучальных устаноў павінны быць заслуханы даклады партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных студэнцкіх арганізацый аб праведзенай у навучальным годзе рабоце па палітычнаму выхаванню студэнцтва і паведамленні гэтых арганізацый аб плане правядзення канікул.

Да свят павінна быць прыўрочана прэміраванне лепшых ударнікаў вучобы, прэміруючы іх галоўным чынам рэчамі (касцюмы, бялізна, і т. д.).

ЦК ВЛКСМ абавязаў абкомы, крайкомы і ЦК ЛКСМ нац. рэспублік забяспечыць бясплатнае прадстаўленне студэнцтву 29-30 чэрвеня ўсіх паркаў, стадыёнаў, водных станцый і арганізаваць для студэнтаў спецыяльныя канцэрты, спектаклі, кіно-сеансы і масоўкі за горадам.

# Заліковую сесію правядзем на „выдатна"

## Даць яшчэ больш высокія паказчыкі

Універсітэт, змагаючыся за палепшанне якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў культурнага фронта, пашыраючы навукова-педагагічны склад за кошт прыцягнення новых высока-кваліфікаваных навуковых работнікаў, паляпшаючы метады выкладання, атрымлівае новыя дасягненні,ператвараючыся ў сапраўдную вядучую навукова-навучальную ўстанову БССР.

Вынікі надыходзячай заліковай сесіі пакажуць наколькі універсітэт справіўся са сваімі задачамі ў гэтым навучальным годзе.

Але трэба памятаць, что вынікі заліковай сесіі ў значнай ступені залежаць ад таго, як падрыхтаваліся да яе і наколькі правільна яна праводзіцца. На жаль, не гледзячы на маючыйся вялікі вопыт правядзення заліковай сесіі, у нас у падрыхтоўцы да прадстаячай сесіі ёсць вельмі многа недапушчальных недахопаў, частка якіх прыводзіцца намі сёння ў змяшчаемых заметках.

Многія навуковыя работнікі ў апошнія гадзіны, замест абагульняючых лекцый, яшчэ толькі заканчваюць свае курсы ўзмоцненымі тэмпамі і, зразумела, некаторыя з іх комкаюць апошнія тэмы сваёй праграмы.

Па большасці дысцыплін, якія не ўваходзяць у заліковую сесію, не вялося бягучага ўліку і ў самыя апошнія дні толькі сталі выяўляць веды студэнтаў, ператвараючы заключныя канферэнцыі ў афіцыйны прыём заліка за ўвесь курс. У выніку студэнты, замест аддачы большасці часу для падрыхтоўкі вядучых заліковых дысцыплін, да самага пачатку заліковай былі заняты напружанай здачай не сесійных прадметаў.

У многіх групах адстаючыя студэнты прадстаўлены самім сабе, ніхто і не думае арганізаваць ім дапамогу.

Яшчэ не адчуваецца пераключэнне работы бібліятэкі да заліковай сесіі. Студэнты яшчэ з 8 гадзін хочуць знайсці месца работаць, але бібліятэка гэтага не ўлічвае і чытальня адчыняецца аж у 10 гадзін. У чытальні няма вады і яе нават ва ўсім корпусе часта не знойдзеш.

Выпраўленнем на хаду важнейшых недахопаў факультэты павінны, змагаючыся за пераходны сцяг БДУ, даць яшчэ больш высокія паказчыкі, чым у мінулыя сесіі.

## Усе сілы—на паспяховую здачу залікаў

Надыходзячая заліковая сесія ставіць перад намі асабліва высокія запатрабаванні. Яна падвядзе вынікі гадавой работы студэнцтва і навуковых работнікаў. Важнасць гэтай праверкі асабліва падкрэсліваецца цяпер, пасля гістарычных указанняў тав. Сталіна аб падрыхтоўцы кадраў.

З чым прышоў біялагічны факультэт да заліковай?

Большасць дысцыплін выкладалася на працягу года раўнамерна, без перабояў. Тэорыя цесна ўвязвалася з практычнымі заняткамі. Над такімі дысцыплінамі, як батаніка (1 курс), сістэматыка раслін (3 курс) студэнты сістэматычна працавалі над матэрыялам. На жаль, гэтага нельга сказаць у адносінах да раду іншых дысцыплін. Па некаторым прадметам меліся частыя зрывы, змены выкладчыкаў (палітэканомія—1-ы курс, дыямат і гісторыя партыі—2-гі курс). Некаторыя дысцыпліны былі пройдзены „залпам" за 2-3 тыдні, прычым у дзень чыталася па 6-8 гадзін.

Але, не гледзячы на такія ўмовы, трэба канстатаваць, што ў выніку ўпартай работы студэнты добра засвоілі праграмны матэрыял. Пра гэта сведчаць вынікі падагульнення сконченых дысцыплін, не ўваходзячых у сесію.

Тое, што зроблена ў падрыхтоўцы да заліковай нельга лічыць дастатковым. Агульны план факультэта не забяспечыў своечасовага сканчэння дысцыплін, уваходзячых у сесію. Так, на 1 курсе фізіка скончана толькі 10/VI. Для паўтарэння часу не засталося.

Больш усяго пытаннямі падрыхтоўкі да заліковай займалася кафедра марфалогіі і сістэматыкі раслін. (Загадчык кафедры праф. **Бордакоў**). Кафедра абгаварыла мэтадычны бок правядзення залікаў, вызначаны выкладчыкі для кансультацый; абсталявана спецыяльная аўдыторыя з нагляднымі дапаможнікамі па курсу батанікі. Тут студэнты змогуць рыхтавацца да залікаў. Праводзяцца экскурсіі ў прыроду.

Дэканат своечасова склаў план правядзення сесіі, што дала магчымасць кожнаму студэнту загадзя скласці план падрыхтоўкі да залікаў.

Значная работа праводзіцца па лініі грамадскіх арганізацый факультэта. Праведзена перезаключэнне соцдагавароў. Наладжана работа гурткоў самадапамогі па ўсім дысцыплінам, уваходзячым у сесію. Гэтыя гурткі працуюць сістэматычна.

Ход падрыхтоўкі да заліковай сесіі асвятляецца ў групавых штодзёнках.

Не гледзячы на ўсе прабелы, дапушчаныя ў рабоце факультэта за год, мы маем усе магчымасці скончыць навучальны год з поспехам.

Студэнцтва прыкладзе ўсе сілы для таго, каб на аснове соцспаборніцтва і ўдарніцтва даць яшчэ лепшыя паказчыкі, чым у мінулую заліковую сесію.

Рэктарату-ж неабходна будзе ўлічыць недахопы гэтага навучальнага года, каб не паўтараць іх у будучым.

Ш а ц.

## СУР'ЁЗНЫЯ ПРАБЕЛЫ

Да заліковай сесіі на фізмаце ў асноўным рыхтаваліся на працягу ўсяго навучальнага года. На першым і другім курсах працавалі гурткі сумеснай прапрацоўкі матэрыялаў, дзе аказвалася дапамога слабейшым. Студэнты забяспечаны падручнікамі і ў асноўным праграмамі. Лекцыі ў гэтым годзе чыталіся глыбока і пашырана. (праф. Пятосін, Сняткоў).

Аднак, трэба сказаць, што не ўсё яшчэ зроблена. Ёсць яшчэ многа сур'ёзных недапоў у падрыхтоўцы да залікаў. Многія студэнты маюць вялікую акадэмзапазычанасць. Яшчэ да гэтага часу не ліквідавана 17 „хвастоў", якія ў некаторых студэнтаў трэціх курсаў цягнуцца з першага і другога курсу (Жукаборская—III к. не здала яшчэ фізікі за I курс).

Вышэйшая алгебра, вектарны аналіз, хімія ў апошнія дні чыталася такімі шпаркімі тэмпамі, што студэнты не паспявалі прапрацоўваць матэрыял. Фізіка і дыферэнцыяльная геаметрыя на другіх курсах зусім не падагулены, прычым фізіка чыталася да 7/VI, не гледзячы на загад—1/VI спыніць чытаць лекцыі па дысцыплінах, не ўваходзячых у заліковую сесію. Усё гэта сведчыць аб тым, што выкладчыкі даных прадметаў не здолелі ўлажыцца ў адведзеныя ім гадзіны.

Зрывы лекцый на другіх курсах увайшлі у сістэму. Так сарваліся лекцыі — 17/V — 2 гадзіны аналіза, 3/VI—2 гадзіны дыямата, за апошні час зрываліся ў кожную шасцідзёнку 2 гадзіны гісторыі партыі.

Р. З.

## Слабейшым не дапамагаюць

На першым курсе групы фізікаў поўным ходам ідзе падрыхтоўка да заліковай сесіі. Па ўсіх сесійных дысцыплінах курс ужо закончан і цяпер праводзіцца падагульненне і паўтарэнне больш цяжкіх і ўзлавых тэм.

Але-ж на шляху падрыхтоўкі да заліковай сесіі не ўсё гладка. На сённешні дзень ў цэнтры ўвагі студэнтаў знаходзяцца дысцыпліны, якія не ўваходзяць у заліковую сесію, позна пачалі іх падагульняць і толькі зараз узяліся за падвядзенне вынікаў гадавой паспяховасці.

Другі недахоп заключаецца ў тым, што не арганізаваны гурткі для падрыхтоўкі і слабейшыя студэнты прадастаўлены самім сабе.

Пантусевіч.

## У АПОШНІЯ МІНУТЫ

На геалагічным факультэце яшчэ не выкананы праграмы па сесійным дысцыплінам. З прычыны таго, што да 5-га чэрвеня праводзілася практыка; гурткі па падрыхтоўцы да залікаў працавалі не сістэтычна. У групе „А" 1-га курса на сённешні дзень яшчэ не ліквідаваны 5 „хвастоў" па нямецкай мове і фізічнай геаграфіі. „Хвасты" маюць нават некаторыя комсамольцы (**Корабаў, Шумілін**).

І толькі цяпер, у апошнія мінуты, калі мы ўшчыльную падыйшлі да заліковай сесіі на факультэце складаюць планы работы гурткоў па дапамозе адстаючым, намячаюць правядзенне праверкі індывідуальных і групавых дагавароў.

Іерусалімская.

## Комсамол біяфака

У першай палове навучальнага года біяфак меў многа недахопаў. Факультэт быў засмечан класава-варожымі элементамі, ад якіх рашуча прышлося ачышчацца. Новае партыйна-комсамольскае кіраўніцтва біяфка (парторг тав. Сіманенко і комсамольскі арганізатар тав. Фрыд) мабілізавала ўсю партыйна-комсамольскую арганізацыю і ўвесь актыў на ўзняцце палітычнага і культурнага выхавання комсамольцаў, на палепшанне акадэмічнай работы, самастойнай работы над падручнікамі.

Наладжана палітвучоба. Чытаемасць газет правяраецца шляхам палітінфармацый; праводзіцца групавая прапрацоўка газетнага матэрыяла і твораў Леніна, Сталіна па інтэрнатам, за што адказваюць комсамольцы.

Па факультэту праведзен шахматны турнір, арганізавана дошка, на якой штодзённа вывешваецца „**Правда**". Праз газету праводзіцца абмен думак на мастацкія творы.

У галіне акадэмпаспяховасці комсамол факультэта служыць прыкладам для ўсіх студэнтаў. Лепшай комсамольскай групай па факультэту з'яўляецца група 1-га курса „Б" (комсамольскі арганізатар **Вечар**), Сярод комсамольцаў няма ніводнага „НЗД" у большасці займаюцца на „Добра" і БД Не дрэнна працуе комсамольская група 2-га курса батанікаў (комсамольскі арганізатар **Галіонка**).

Лепшымі комсамольцамі факультэта па акадэмпаспяховасці і грамадскай рабоце з'яўляюцца т. т. **Пузевіч, Фрыд, Шац, Партная, Галіонка, Найман, Пятруша, Петрашкевіч, Метчанка.**

**Комсамолец біяфака.**

Парторг фізмата—тав. ЗАГОРСКІ

## ЯК МЫ ПРАЦУЕМ

Чоткая і планавая работа, пачынаючы ад кожнага партгрупорга да дэканата; адказнасць за даручаную работу і сістэматычная праверка, як выконваецца кожнае даручэнне і заданне; канкрэтнае аперацыйнае кіраўніцтва кожным комуністам—вось тое асноунае, з чаго я выхожу ў кіраўніцтве партгрупай і работай усіх факультэцкіх арганізацый.



Гэта асабліва важна для нас, дзе партыйная праслойка параўнаўча нізкая як сярод студэнцтва, так і навуковых работнікаў (менш 10 проц.).

Я надаю надзвычай вялікае значэнне партыйным сходам—школе выхавання комуністаў. Неабходна вельмі ўважліва, клапатліва падрыхтоўваць сходы, каб на іх кожны партыец, комсамолец, студэнт, навуковы работнік сапраўды маглі вучыцца большэвізму. Неабходна падбіраць актуальнейшыя для данага схода пытанні і ставіць іх у канкрэтнай практычнай форме.

Сходы партгруп мы праводзім 2 разы ў месяц працягам не больш 2-3 гадзін. Пастановы, у адрозненне ад ранейшых, насіўшых агульны характар, з'яўляюцца прамым даручэннем таму ці іншаму таварышу на асобным вучастку работы.

Пытанні, якія абгаварваюцца на сходзе загадзя падыхтоўваюцца і накіраваны на партвыхаванне і рост комуніста.

Практыкуемыя індывідуальныя адчоты комуністаў з'яўляюцца найлепшым метадам праверкі, як даны член ці кандыдат партыі выконвае свае партыйныя абавязкі, з'яўляюцца метадам для ўказанняў у рабоце другіх таварышоў.

На гэтых адчотах мы вучым комсамольскую масу, масу студэнцтва, як трэба працаваць, каб апраўдываць пачэснае званне члена ці кандыдата партыі.

Палітмасавая выхаваўчая работа ў асноўным праводзіцца праз палітзаняткі. Комуністы і комсамольскі актыў впвучаюць гісторыю партыі ў школе партактыва.

На аснове праведзенай шырокай масавай работы сярод беспартыйнага студэнцтва і, у прыватнасці, у сувязі з распрацоўкай пастановы Ленінградскага Гаркома аб партмасавай рабоце створана група спачуваючых з 6 чалавек.

Трэба адзначыць, што комуністы яшчэ не занялі авангарднай ролі ў акадэмпаспяховасці. У асноўным займаюцца на „Здав." і рэдка на „Добра". Гэта ставіць перад нашай партгрупай, як бліжэйшую задачу—узняць паспяховасць комуністаў і кандыдатаў партыі на аснове партыйна-выхаваўчай работы, вывучэнні гісторыі партыі, марксізма-ленінізма, дабіўшыся вядучай ролі ў сваёй асноўнай вытворчай галіне.

## Іван Владзіміравіч МІЧУРЫН

7 чэрвеня у 9 гадзін 30 мінут памёр вялікі вучоны, селекцыянер, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі, ганаровы акадэмік **Іван Владзіміравіч Мічурын**



**МІЧУРЫН** нарадзіўся ў 1854 годзе ў Разанскай губерніі. Скончыўшы ў 1875 годзе Разанскую гімназію, ён перасяліўся ў гор. Казлоў, дзе працаваў звычайным канторшчыкам на чыгунцы. Там Мічурын упершыню пачаў свае вопыты па развядзенню новых каштоўных сартоў садовых раслін.

За 60 год сваёй работы Мічурын вывёў звыш 300 новых гатункаў пладоў і ягад.

Расійскія дарэволюцыйныя вучоныя і чыноўнікі дэпартамента земляробства пагардліва адвяргалі работы Мічурына. Толькі Совецкая ўлада дастойна ацаніла працу вялікага вучонага.

Да 50-гадовага юбілея навуковай дзейнасці Мічурына ўрад узнагародзіў яго ордэнам Чырвонага працоўнага сцяга. У 1931 годзе Мічурын атрымлівае ордэн Леніна.

Да 60-годдзя сваёй навуковай дзейнасці ў верасні мінулага года Мічурын атрымлівае званне заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі.

**Студэнты, навуковыя і адміністрацыйна-тэхнічныя работнікі універсітэта ў прынятай рэзалюцыі на мітынгу 9/VI выразілі свае глыбокае спачуванне з прычыны смерці вялікага совецкага вучонага І. В. Мічурына**

## Апраўдаем высокае званне совецкага спецыяліста.

4 месяцы ўпартай работы над выкананнем сваіх дыпломаў паказалі, што студэнцтва хімічнага факультэта сапраўды аўладалі тэхнікай хімічнага эксперымента, аўладалі тэорыяй і практыкай хімічнай навукі.

Большасць работ грунтуецца выключна на эксперыментальным матэрыяле саміх дыпломнікаў і цесна звязаны з практыкай нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

Па водзывам кіраўнікоў многія дыпломныя работы могуць быць надрукаваны ў нашых совецкіх навуковых часопісах, а таксама пасланы за мяжу, бо яны, апрача свайго навуковага значэння, маюць вельмі цікавыя вывады.

Мы, дыпломнікі Хімфака, апрача нашых непасрэдных кіраўнікоў—прафесароў **Змачынскага, Прылежаева, Казлова, Ермоленко, Нікіфарава**, дац. **Асіпенка**—адзначаем лепшых асістэнтаў факультэта—**Федасеева, Карповіч, Малішэўскую.** Яны многа дапамагалі студэнцтву аўладаць тэхнікай тонкага хімічнага эксперымента і забяспечылі нас поўнасцю неабходнай апаратурай і рэактывамі.

Разам з гэтым мы павінны адзначыць, што некаторыя кафедры, у прыватнасці, кафедра арганічнай хіміі (гаспадарчы асістэнт **Пятровіч**) зразу не зусім добра падрыхтаваліся да прыёму дыпломнікаў. У пачатку работы адчуваўся вялікі недахоп штатываў, пробак, пасуды і інш. Наглядаліся грубыя адказы на патрабаванні студэнтаў з боку тав. **Пятровіча**, лаборанта **Кішкіна** і гэтым самым выклікалі прастоі дыпломнікаў.

Комсамольскі арганізатар факультэта тав. **Шапіро** часта адрывала комсамольцаў-дыпломнікаў на розныя сходы, паседжанні, ад якіх яны свабодна маглі быць аслаблены.

Мы, студэнты выпускнікі, з поўнай адказнасцю запэўніваем партарганізацыю і рэктарат універсітэта, што з задачамі, якія стаяць перад намі, мы справімся. Апраўдаем высокае званне совецкага спецыяліста-хіміка. Усе веды, якія даў нам універсітэт, аддадзім на карысць соцыялістычнага будаўніцтва.

Група дыпломнікаў:
**Оліфсон, Лаўрыновіч, Лазароў**

Па слядах нашых выступленняў

## „Факты бяздушша і безадказнасці"

На гэту заметку, змешчаную ў нумары 2 нашай газеты аб недахопах работы хімфака, дэканат факультэта паведамляе:

Гісторыя партыі цяпер выкладаецца нармальна.

Факты аб нетактычных адносінах тт. **Зібіцкер** і **Грунтфест** да некаторых навуковых работнікаў на сходзе групы поўнасцю пацвердзіліся, за што загадам дэкана яны атрымалі вымову.

Адносна выкладання нямецкай мовы некалькі разоў ставілася пытанне перад навучальнай часткай але ніякіх вынікаў не атрымалі. Звяртаем на гэта ўвагу тав. **Каляды.**

## „Такіх не выпускаюць"

У нашай газеце ад 29 мая пісалася, што некаторыя дыпломнікі фізмата маюць акадэмзапазычанасць.

Дэкан факультэта паведамляе, што гэтым студэнтам у гаду даваліся папярэджанні і не гледзячы на гэта яны запазычанасць не ліквідавалі. З гэтай прычыны яны не будуць допушчаны да абароны дыпломаў і не будуць выпушчаны з універсітэта пакуль не здадуць адзначаныя дысцыпліны.

**Барычэўскі** мае акадэмзапазычанасць па прычыне хваробы.

## АБ ВЫНІКАХ ПАРТВУЧОБЫ

Партыйная вучоба ў БДУ закончана ітогавымі тэарэтычнымі канферэнцыямі, якія далі больш-менш поўны малюнак вынікаў партвучобы.

Вынікамі гэтымі наша партарганізацыя задаволена быць не можа. Нізкая якасць дакладаў і малая актыўнасць у выказваннях слухачоў, асабліва па гісторыі партыі, сведчыць аб слабай рабоце на працягу года, аб слабым засваенні прапрацаваных тэм.

Так, на канферэнцыях па гісторыі партыі групы, з якімі займаліся т т. **Гельфанд, Маханек, Карнейчык**, з 8 дакладаў толькі адзін даклад т. **Малюкевіча** не патрабаваў папраўак. Найбольш слабы даклад зрабіў тав. **Загорскі.** Галоўны недахоп амаль усіх дакладаў—гэта няўменне з боку дакладчыкаў (**Загорскі, Пазнякоў, Кацман,** часткова **Дучыцкая**) паказаць палітычны твар контррэволюцыянераў Троцкага, Каменева, Зіноўева, увязаць асобныя моманты іх выступленняў супроць лініі партыі на розных этапах з іх агульнай контррэволюцыйнай лініяй. Астатнія-ж таварышы ў выказваннях цалкам не маглі выправіць гэтыя недахопы.

Даволі характэрнымі з'яўляюцца адносіны да канферэнцыі значнай часткі таварышоў, асабліва з хімфака, фізмата і біяфака.

Нам цяпер не да канферэнцый, нам трэба пісаць дыпломныя работы, альбо трэба рыхтавацца да залікаў—так гаварылі многія з тых, хто прышоў на канферэнцыю. (**Сікорская, Кацнельсон, Нікалаеня**). А значная частка таварышоў заняла яшчэ горшую пазіцыю. У іх, як відаць, хапіла сумлення зусім не з'явіцца на канферэнцыі. Так, у гурток Карнейчыка 4/VI з 41 чал. з'явілася толькі 12 чал. Сярод адсутнічаючых аказаліся і такія, як комсамолка **Перламутр**, якая разам з іншымі ў час дажджу прастаяла ў карыдоры прыродазнаўчага корпуса, а падняцца ў 313 аўдыторыю, дзе праводзілася канферэнцыя, не палічыла патрэбным.

Не менш дрэнным з'яўляецца і тое, што ніводны з парторгаў факультэтаў, за выключэннем тав. **Лапунова**, не пацікавіўся ў час заняткаў паглядзець, як праяўляюць сабе на канферэнцыі партыйцы і комсамольцы.

Слабае засваенне палітыкі і гісторыі нашай партыі, нездаровая баязлівасць выкрыць гэтую слабасць і недаацэнка партвучобы—вось тыя асноўныя недахопы, якія выяўлены на ітогавых занятках па партвучобе.

Карэнні гэтых недахопаў крыюцца не толькі ў нездавальняючай рабоце ўнутрыуніверсітэцкай сеткі партасветы (слабая работа з прапагандыстамі, адсутнасць амаль да канца года партгабінета, адсутнасць кансультацый, несвоечасовае апавяшчэнне слухачоў аб чарговай тэме). Але галоўнае—гэта нездавальняючы стан унутрыпартыйнай і палітыка-выхаваўчай работы ў нашых партгрупах і недастатковы кантроль за гэтай работай з боку парткома.

Калі мы, напрыклад, пагледзім на такую канкрэтную справу, ак партыйнае ўздзейнічанне ў партгрупах на тых таварышоў, якія не наведвалі заняткі партвучобы, альбо не рыхтаваліся да заняткаў,—дык даных па гэтай справе ў нас аказваецца вельмі мала. Есць выпадкі, калі асобныя таварышы не наведвалі партвучобу і партгрупы на гэта не рэагавалі

Выпраўленне гэтых недахопаў нашай партработы павінна будзе стаяць у ліку першачарговых задач у пачатку наступнага навучальнага года.

**Е. Карнейчык.**

## „Дзе-ж прэмія?"

У нумары ад 22 мая была змешчана заметка аб тым, што прафком не выдае прэмій членам рэдкалегіі фізмата, якія былі прэміраваны за ўдарную работу яшчэ ў першай палове навучальнага года.

Партком у сваёй пастанове абавязаў прафком выдаць прэміі ў пяцідзённы тэрмін.

Адказны рэдактар С. ГУЗЕЙ

Менгарліт № 2046. Тыр. 1000 Зак. № 697.
Друкарня БелАН.